# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны

“Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава”,

прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыйнае даследаванне Дзігадзюк В. П. прысвечана вывучэнню тэмпаральнай прасторы беларускай мастацкай прозы, вызначэнню моўнай рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава. Даследаванне мовы мастацкага твора, сродкаў і спосабаў рэпрэзентацыі тэкставых катэгорый з’яўляецца перспектыўнай і запатрабаванай праблемай сучаснага мовазнаўства.

Актуальнасць тэмы дысертацыі Дзігадзюк В. П. вызначаецца неабходнасцю распрацоўкі кваліфікацыйных, класіфікацыйных і сістэмаўтваральных параметраў для ўпарадкавання тыпа-відавога класа катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава. Даследаванне дазволіла выявіць моўную рэпрэзентацыю катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў раманах даследуемага аўтара, тыпаўтварэнне значэнняў праспекцыі (кампазіцыйна-тэкставая, сюжэтна-кампазіцыйная) і рэтраспекцыі (адсылачная, кампазіцыйна-тэкставая, тэкставая сюжэтная) і іх маркераў, што спрыяе ўзбагачэнню тэарэтычнай базы мовазнаўства. Аўтар знаёмы са спецыяльнай літаратурай па тэме дысертацыі і мае свае адказы на яшчэ не вырашаныя ці спрэчныя пытанні, звязаныя з кваліфікацыяй і класіфікацыяй катэгорый мастацкага часу.

Навуковая навізна вынікаў дысертацыйнага даследавання Дзігадзюк В.П. заключаецца ў тым, што ўпершыню зроблены аналіз і сістэматызацыя сродкаў моўнага выражэння праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор з улікам магчымасці структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі праспекцыі і рэтраспекцыі і іх моўнай рэпрэзентацыі, а таксама сюжэтна-кампазіцыйных і жанравых асаблівасцей мастацкіх твораў; установлены логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі блокамі з улікам колькаснага складу іх кампанентаў.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання ў дысертацыі сфармуляваны асноўныя палажэнні, што выносяцца на абарону, якія бачацца нам навукова абгрунтаванымі, падпарадкаванымі асноўнай мэце работы і цалкам пацвярджаюцца яе зместам. Структура дысертацыйнага даследавання адпавядае вызначаным мэце і задачам, якія вырашаюцца з дастатковай паўнатой і дакладнасцю.

Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечваецца кваліфікаванай апрацоўкай

значнага аб'ёму фактычнага матэрыялу (1463 рэтраспектыўных і праспектыўных тэкставых блокаў). На аснове ўсебаковага аналізу і сістэматызацыі моўных сродкаў рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі, вызначаюцца тыпы, віды даследуемых катэгорый, адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі структурамі.

Праца грунтуецца на значнай колькасці крыніц, што дазваляе аўтару дысертацыі зрабіць абгрунтаваныя і пераканаўчыя вывады, якія выступаюць доказам асноўных палажэнняў, вынесеных на абарону. Адным з каштоўных вынікаў даследавання падаецца пабудова тыпалогіі, а таксама выяўленне і класіфікацыя логіка-семантычных адносін паміж узаемаабумоўленымі праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі адзінкамі, што было зроблена ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве.

У аўтарэфераце Валянца Паўлаўна заканамерна сцвярджае, што загаловак выступае маркерам праспекіыўнага плана мастацкага твора (палажэнне другое). Хацелася б пачуць больш разгорнутае тлумачэнне механізма дадзенай з'явы.

Атрыманыя вынікі дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый, пры выкладанні стылістыкі беларускай мовы, тэорыі камунікацыі, філалагічнага аналізу тэксту на філалагічных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, хочацца падкрэсліць, што дысертацыя Дзігадзюк В. П. выканана на належным навуковым узроўні, метадалагічная база і тэарэтычныя асновы бачацца грунтоўнымі. Структура даследавання лагічная і паслядоўная. Такім чынам, кандыдацкая дысертацыя Дзігадзюк В. П. адпавядае ўсім патрабаванням, што прад'яўляюцца да работ падобнага тыпу, а яе аўтар заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства БДУ
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Г.К. Чахоўскі

Подпіс дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства БДУ кандыдата філалагічных навук, дацэнта Г.К. Чахоўскага
сведчу

Намеснік дэкана філалагічнага факультэта БДУ
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Т.В. Мальцэвіч